УДК 323.1(476) + 930.1(476)

# ДАСЛЕДАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ У БЕЛАРУСІ Ў БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1920-х гг.

*Д. А. Крэнт*
аспірант
Інстытут гісторыі НАН Беларусі

*У артыкуле асвятляецца праблема даследавання іншанацыянальнага насельніцтва Беларусі ў беларускай савецкай гістарыяграфіі 1920-х гг. Публікацыя падрыхтавана на падставе прац, прысвечаных гісторыі нацыянальных меншасцей у Беларусі, а таксама шэрагу архіўных матэрыялаў. Вылучаны асноўныя тэматычныя блокі, у межах якіх вывучалася мінулае нацыянальных меншасцей. Робіцца выснова пра тое, што для даследаванняў па палітычнай гісторыі і гісторыі асветы была ўласціва аднастайнасць ацэнак, палітычная заангажаванасць. З іншага боку – для работ, прысвечаных узаемаўплывам нацыянальных меншасцей з беларускім насельніцтвам, была характэрна ідэйная разнастайнасць, адрозненне поглядаў на мінулае шэрагу нацыянальных меншасцей у Беларусі.*

**Ключавыя словы:** гістарыяграфія, нацыянальныя меншасці, нацыянальная палітыка, асвета, палітычная гісторыя, міжнацыянальнае ўзаемадзеянне.

### Уводзіны

Асаблівасцю насельніцтва Беларусі з'яўляецца яго шматнацыянальны характар. На працягу значнага прамежку часу ўнёсак ва ўсе сферы жыцця краіны і грамадства зрабілі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Пра апошняе сведчыць з'яўленне спецыялізаванай літаратуры, прысвечанай розным аспектам мінулага шэрагу нацыянальных меншасцей у Беларусі: яўрэяў, палякаў, літоўцаў, латышоў, татараў, цыганоў і інш. Працы, прысвечаныя гісторыі, дэмаграфіі і этнаграфіі нацыянальных меншасцей у Беларусі, пачалі з'ўляцца ў часы Расійскай імперыі. Аднак толькі ў міжваенны перыяд іх вывучэнне набыло сістэматызаваны характар. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз беларускага савецкага вопыту даследавання нацыянальных меншасцей.

### Асноўная частка

Праблема нацыянальнай разнастайнасці насельніцтва Беларусі набыла актуальнасць падчас афармлення беларускай дзяржавы. Абвяшчэнне БНР, а пасля і БССР паставіла на парадак дня задачу вызначэння, а пасля і аб'яднання беларускай этнічнай тэрыторыі. Апошняе стала імпульсам для арганізацыі дэмаграфічных і этнаграфічных даследаванняў, скіраваных на вывучэнне нацыянальнай структуры насельніцтва Беларусі.

Зварот да беларускага савецкага вопыту дазваляе сцвярджаць, што галоўнай прычынай актуалізацыі даследаванняў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у Беларусі, стала нацыянальная палітыка, якая праводзілася ў Савецкай дзяржаве. Стратэгія ў межах правядзення адзначанай палітыкі, накіраванай на падтрымку нацыянальных меншасцей, закранула і навуковую сферу дзейнасці. У Савецкай Беларусі апошняе праявілася ў арганізацыі шэрагу нацыянальных навукова-даследчых падраздзяленняў пры Інстытуце беларускай культуры: яўрэйскага аддзела (пачаў афармляцца ў 1921 г., з 1927 г. – сектар), польскага аддзела (з 1925 г., з 1927 г. – сектар), кафедры гісторыі Літвы (з 1927 г.), Латышскай камісіі (распачала працу прыблізна ў пачатку 1928 г.) [1].

Палітычную значнасць згаданай праблемы адлюстроўвае той факт, што арганізацыя паняццяў і тэрмінаў, характарызуючых нацыянальную разнастайнасць, уваходзіла ў кампетэнцыю прадстаўнікоў кіруючых органаў, якія займаліся выпрацоўкай і рэалізацыяй практычных мерапрыемстваў нацыянальнай палітыкі ў СССР і БССР.Навукоўцы ў даследаваннях 1920-х гг., аперыруючы такімі паняццямі і тэрмінамі, як "нацыя-

© Крэнт Д. А., 2019

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нальная меншасць", "калонія" і інш., не ставілі задачу раскрыць іх сутнаснае значэнне, не ўзнімалі пытанне, якія з этнічных груп варта адносіць да нацыянальных меншасцей. Адзіным выключэннем з шэрагу даследаванняў 1920-х гг. з'яўляецца артыкул беларускага мовазнаўцы Л. Цвяткова "Некалькі словаў аб менскіх татарах" (1927). Навуковец канстатаваў: "Невялікая розніца ў культуры і побыце патрабуюць далейшых доследаў татарскага насельніцтва з мэтай высвятлення іх статусу: з'яўляюцца ці яны асобнай нацыянальнай меншасцю або спецыфічнай рэлігійнай групай мусульман-беларусаў у адным радзе з беларусамі-праваслаўнымі і беларусамі каталікамі" [2, с. 17].

Азнаямленне з беларускай савецкай гістарычнай літаратурай 1920-х гг., прысвечанай нацыянальным меншасцям у Беларусі, дазваляе вылучыць некалькі тэматычных блокаў, у межах якіх вывучалася іх мінулае. Атрымалі асвятленне праблемы развіцця сістэмы адукацыі, палітычнай гісторыі, узаемадзеяння асобных этнічных груп з тытульным насельніцтвам.

Пэўны інтарэс назіраўся да асвятлення адукацыйнай палітыкі ў дачыненні да нацыянальных меншасцей у часы Расійскай імперыі. Так, у 1920-я гг. з'явілася некалькі агляднах прац, прысвечаных гісторыі адукацыі і сучаснаму становішчу латышскага, літоўскага, польскага і яўрэйскага насельніцтва ў БССР [1; 3]. Адзначаныя працы мелі не навуковы, а публіцыстычны характар. Выключэннем у гэтым плане з'яўляюцца працы Ю. Дардака і Л. Мышкоўскага, прысвечаныя гісторыі асветы яўрэйскага насельніцтва ў Беларусі [4; 5]. Аўтары прац сыходзіліся ў сваіх ацэнках, падкрэслівалі, што існуючая ў час Расійскай імперыі сістэма адукацыі з'яўлялася інструментам русіфікацыі і сродкам рэлігійнай прапаганды. На думку складальнікаў прац, толькі пасля звяржэння самаўладства можна было гаварыць пра пераход да нацыянальнай сістэмы адукацыі. У адзначаным выпадку апеляцыя да мінулага згаданых народаў на Беларусі здзяйснялася для таго, каб паказаць кантраст паміж нацыянальнай палітыкай, якая праводзілася ў Расійскай імперыі царскім урадам, і маладой Савецкай дзяржавай.

Значнае месца ў даследаваннях 1920-х гг. адводзілася праблеме палітычнай гісторыі, удзелу ў рэвалюцыйным руху прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. У першую чаргу асвятлялася дзейнасць яўрэйскіх арганізацый сацыялістычнай арыентацыі. Факт дамінавання яўрэйскага нацыянальнага кампанента ў палітычным полі беларускага краю прызнаваўся нават у абагульняючых працах па гісторыі Беларусі. Гісторык, палітычны і дзяржаўны дзеяч У. Ігнатоўскі ў "Кароткім нарысе гісторыі Беларусі" (1919) адзначаў: "Для беларускага горада з'яўляўся тыповым марксісцкі рабочы рух, афарбаваны ў габрэйскі нацыянальны тон" [6, с. 172]. Даследчык канстатаваў, што яўрэйскія арганізацыі мелі ўплыў і на беларускія народныя масы. У якасці прыкладу гісторык прыводзіў той факт, што З. Жылуновіч, старшыня Часовага ўраду БССР, распачаў сваю палітычную дзейнасць у шэрагах Бунда.

Значная ўвага надавалася выяўленню крыніц, прысвечаных яўрэйскаму рэвалюцыйнаму руху ў Беларусі. Гістарычная секцыя яўрэйскага аддзела Інбелкульта на працягу 1924 г. сабрала больш за 500 успамінаў удзельнікаў рэвалюцыйных падзей [7, арк. 73]. Цэнтральнае месца ў выяўленні і накапленні крыніц па палітычнай гісторыі адводзілася Мінскаму Гістпарту, архіўныя фонды якога папаўняліся дакументальнымі калекцыямі пра дзейнасць Бунда, Паалей-Цыёна і іншых яўрэйскіх партыйных арганізацый у рэгіёне.

У аналітычных работах, прысвечаных яўрэйскім арганізацыям, галоўны акцэнт быў зроблены на асвятленні дзейнасці Бунда. Даследчыкаў у першую чаргу

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

цікавілі прычыны адасобленасці дадзенай палітычнай арганізацыі ад агульнарасійскай сацыял-дэмакратыі. На думку гісторыка І. Сосіса, які з'яўляўся ў 1917–1918 гг. сакратаром Петраградскага аддзялення Бунда, апошняму ў значнай ступені садзейнічала "рыса аселасці", існаванне якой стала прычынай ізаляцыі і "нацыяналізацыі" яўрэйскага працоўнага руху ў цэлым і "аўтанамісцкіх" патрабаванняў кіраўніцтва Бунда ў прыватнасці [8, с. 144].

З сярэдзіны 1920-х гг. адбываецца паступовая змена акцэнтаў пры асвятленні дзейнасці яўрэйскага палітычнага кампанента ў Беларусі. Асноўная ўвага пачала надавацца не ўнёску арганізацый у распаўсюджванне сацыялістычных ідэй, а прычынам зніжэння папулярнасці яўрэйскіх партый сярод насельніцтва, бальшавізацыі часткі іх актыву і шараговых членаў у час рэвалюцыйных зрухаў 1917 г. Значныя намаганні да перагляду ацэнак прыклаў былы член Бунда, а пасля актывіст камуністычнага руху С. Агурскі. У сваіх даследаваннях гісторык адносіў найбольш уплывовыя яўрэйскія арганізацыі, у тым ліку і Бунд, да дробнабуржуазных [9]. На яго думку, першапачаткова папулярнасці арганізацыі сярод працоўных яўрэяў садзейнічаў той момант, што агітацыю згаданая партыя праводзіла на мове ідыш. Галоўнай прычынай зніжэння палітычнай вагі партыі сярод працоўных падчас Першай сусветнай вайны даследчык лічыў кансерватыўнасць яе тагачаснага кіраўніцтва і бальшавізацыю партыйнага актыву [9, с. 18].

Атрымала асвятленне і праблема дзейнасці польскіх палітычных арганізацый у Беларусі. Ад моманту афармлення польскага аддзела Інбелкульта ў 1925 г., яго гістарычная секцыя мусіла распачаць вывучэнне крыніц у касцельных архівах, а таксама ўпарадкаваць дакументы Польскага бюро ЦК КП(б)Б і Наркамата асветы. Дадзеная работа павінна была здзяйсняцца для выяўлення матэрыялаў па польскім рэвалюцыйным руху ў Беларусі [10, арк. 69]. Вывучэннем палітычнай актыўнасці польскага насельніцтва ў Беларусі займаўся ўдзельнік падзей 1917 г. у Мінску, былы Наркам земляробства БССР, кіраўнік польскага аддзела Інбелкульта і рэктар Камуністычнага ўніверсітэта ў Мінску С. Гельтман. Даследчыкам была падрыхтавана праца па праблеме польскіх працоўных у Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі [11]. Гісторык значную ўвагу ў даследаванні надаў разгляду палітычнай дыферэнцыяцыі польскага сацыялістычнага руху, вызначыў прычыны бальшавізацыі польскіх працоўных у Беларусі. Даследчык прысвяціў частку сваёй работы супрацьстаянню прабальшавіцкі скіраваных польскіх працоўных дзейнасці "контррэвалюцыйных" сіл (у першую чаргу маецца на ўвазе дзейнасць польскага корпуса на чале з Ю. Доўбар-Мусніцкім. – *Д. К.*) [11, s. 68–88].

Вывучэнне палітычнай актыўнасці іншых нацыянальных меншасцей не праводзілася. Апошняе варта звязаць з той акалічнасцю, што прадстаўнікі другіх нацыянальнасцей не мелі моцных палітычных арганізацый на тэрыторыі Беларусі. Аўтарамі прац па гісторыі рэвалюцыйнага руху выступалі былыя яго ўдзельнікі. Даследчыкі сыходзіліся ў сваіх высновах на тым, што дзейнасць палітычных арганізацый нацыянальных меншасцей спрыяла распаўсюджванню ідэй марксізму на беларускай тэрыторыі. Для аўтараў з'яўляўся заканамерным працэс бальшавізацыі працоўных, прыхільнасць асноўнай масы палітычна актыўнага насельніцтва пралетарскага паходжання да камуністычных ідэй. Актуалізацыя праблемы палітычнай гісторыі дала імпульс для актывізацыі пошукавай дзейнасці, пашырэння корпуса дакументальных крыніц. Назіраюцца спробы прыцягнуць да напісання прац эмпірычны матэрыял, які не датычыўся палітычнай гісторыі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Значная частка даследаванняў, прысвечаных нацыянальным меншасцям, закранала праблемы ўзаемадзеяння і ўзаемаўплыву з прадстаўнікамі тытульнай нацыі. Так, беларускі пісьменнік яўрэйскага паходжання З. Бядуля ў сваёй брашуры “Яўрэі на Беларусі: бытавыя штрыхі” (1918) адзначаў, што працэсы культурных і эканамічных узаемаўплываў паміж яўрэямі і беларусамі з’яўляліся ўзаемнымі, звярнуў увагу на тую акалічнасць, што няпоўная сацыяльная структура згаданых нацыянальнасцей садзейнічала фарміраванню своеасаблівага сімбіёзу ў эканамічным жыцці паміж імі [12]. Праблему няпоўнай сацыяльнай структуры яўрэйскага насельніцтва развіваў І. Сосіс [13]. Адной з прычын незацікаўленасці яўрэяў у земляробчых занятках, акрамя абмежавальнага заканадаўства, навуковец лічыў нежаданне апошніх перайсці на самую ніжэйшую, не абароненую з прававога пункту гледжання прыступку сацыяльнай іерархіі.

Актуальным па прычыне ўзаемнага ўзбагачэння культуры цыганоў і беларусаў лічыў вывучэнне мінулага цыганскага насельніцтва беларускі гісторык і археограф Д. Даўгяла [14, с. 34]. У падрыхтаваным ім гістарычным экскурсе даследчык раскрыў толькі характар стаўлення дзяржаўных органаў улады (ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. – *Д. К.*) да цыганскага насельніцтва. Такая тэматычная скіраванасць артыкула ў значнай ступені была выклікана абмежаванасцю крыніцазнаўчай базы. Свае высновы гісторык выбудоўваў на падставе заканадаўчых і актавых матэрыялаў.

Праблема ўзаемадзеяння нацыянальных меншасцей і прадстаўнікоў тытульнай нацыі атрымала разгляд у даследаваннях, прысвечаных татарскаму насельніцтву. У працах Я. Карскага і А. Шлюбскага значная ўвага надавалася вывучэнню татарскай літаратуры і асвятленню прычын пераходу татарскага насельніцтва на беларускую мову [15; 16]. Этнограф А. Шлюбскі галоўнай прычынай пераймання мовы тытульнага насельніцтва мясцовымі татарамі лічыў той факт, што татары-мужчыны былі вымушаны ўступаць у шлюб з прадстаўніцамі карэннага насельніцтва. Даследчык падкрэсліваў:“маткі гаварылі і навучалі сваіх дзяцей на сваёй беларускай мове… а не на невядомай ім татарскай” [16, с. 51]. Даследчыкі сыходзіліся ў думцы, што ва ўмовах паланізацыі татарская літаратура стала адзіным сродкам захавання беларускай пісьмовай мовы ў канцы XVII–XVIIIстст.

Варта вылучыць працы пісьменніка, студэнта Камуністычнага ўніверсітэта ў Мінску, В. Вольскага, які ў другой палове 1920-х гг. выдаў серыю артыкулаў, прысвечаных татарскаму насельніцтву [17; 18; 19]. У яго працах узнімаліся праблемы гісторыі, культуры і этнаграфіі згаданай этнічнай групы ў Беларусі. В. Вольскі звярнуў значную ўвагу на адметнасці татарскага насельніцтва ў Беларусі адносна іншых цюркскіх народаў, іх больш “еўрапеізаваны” побыт і светапогляд [19, с. 29]. Яго ўклад у вывучэнне татарскага насельніцтва ў Беларусі лічыўся настолькі значным, што ў 1929 г. на пасяджэнні Прэзідыума БАН ставілася пытанне аб уключэнні яго ў штат супрацоўнікаў кафедры этнаграфіі як адзінага спецыяліста ў БССР па татарскай праблематыцы [20, арк. 91].

Апошняе сцвярджэнне нельга назваць цалкам слушным. У Інбелкульце, а пазней у БАН, пад кіраўніцтвам А. Ясінскага праходзіў навучанне ў аспірантуры прадстаўнік татарскай супольнасці Беларусі Я. Гембіцкі. Ім быў выдадзены артыкул, прысвечаны стану татарскага насельніцтва ў Беларусі ў часы Вялікага Княства Літоўскага [21]. Акрамя таго, на пасяджэнні Сацыяльна-гістарычнай секцыі Інбелкульта Я. Гембіцкім быў зачытаны даклад “Уплыў “Кітаба” на духоўную культуру літоўскіх татараў у XVI–XVIII стагоддзях“ [22, арк. 185–186].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пэўны інтарэс назіраўся да вывучэння перасяленчага насельніцтва. Так, В. Аўрагаў паказаў асаблівасці культурнага развіцця на прыкладзе канкрэтнай літоўскай вёскі Сафійск (зараз Магілёўская вобласць. – *Д. К.*) [23]. Аўтар канстатаваў, што літоўскае насельніцтва аказалася схільным да асіміляцыі і пераймання беларускай мовы і культуры. Асноўную прычыну дадзенага працэсу даследчык бачыў у распадзе традыцыйнага ўкладу жыхароў літоўскай вёскі, арганізацыі школьнай адукацыі на рускай, а пасля і беларускай мове. У значнай ступені дадзенаму падыходу да даследавання перасяленчага насельніцтва пярэчыў К. Мартэсон у сваёй праграме "Зьбіраньне этнолёгічна-лінгвістычных матэрыялаў сярод латыскага насяленьня БССР" (1929) [24]. Складальніка праграмы цікавілі не асіміляцыйныя працэсы сярод латышоў, а абгрунтаванне адметнасці перасяленцаў. Унікальнасць латышскага насельніцтва ў Беларусі ён бачыў у тым, што, знаходзячыся ў іншанацыянальным асяродку, латышы ў БССР з'яўляліся носьбітамі архаічных рысаў у культуры і мове ў параўнанні з латышскім насельніцтвам Латвіі, якое перажыло працэс нацыянальнай кансалідацыі і падаўлення рэгіянальных адметнасцей [24, с. 53].

Асобна варта вылучыць працу прадстаўніка літоўскай супольнасці ў БССР гісторыка В. Скардзіса "Літоўцы на Беларусі: нарыс аб літоўскіх колёніях" (1929) [25; 26]. У яго артыкуле значная ўвага надавалася гісторыі з'яўлення і эканамічнага развіцця літоўскіх паселішчаў у Савецкай Беларусі. Асвятленне перасяленчага працэсу дало падставу прыйсці да высновы аб не карэнным характары літоўскай этнічнай групы ў тагачаснай БССР. В. Скардзіс не ставіў у рабоце задачы пошуку адметнасцей, унікальнасці літоўскага насельніцтва. Даследчык імкнуўся паказаць яго блізкасць з тытульным насельніцтвам, пры гэтым не ў культурным вымярэнні, а эканамічным і сацыяльным. У дадзеным выпадку яго даследаванне з'яўлялася своеасаблівым прадвеснікам да вывучэння мінулага нацыянальных меншасцей, якое пачало дамінаваць у 1930-я гг.

**Заключэнне**

Такім чынам, у сувязі са складаным працэсам афармлення беларускай дзяржавы, асаблівасцямі нацыянальнай палітыкі, якая праводзілася ў БССР праблема мінулага нацыянальных меншасцей у Беларусі набыла актуальнасць. У беларускай савецкай гістарыяграфіі 1920-х гг. можна вылучыць адносна невялікую колькасць тэматычных блокаў, у межах якіх вывучалася мінулае нацыянальных меншасцей, што варта звязаць з зародкавым станам даследаванняў. Для работ, прысвечаных гісторыі асветы, было ўласціва асвятленне адмоўных бакоў арганізацыі школьнай адукацыі ў часы Расійскай імперыі. Для даследаванняў, прысвечаных палітычнай гісторыі нацыянальных меншасцей, характэрнай асаблівасцю становіцца разуменне ролі польскіх і яўрэйскіх палітычных арганізацый як рэтранслятараў і распаўсюджвальнікаў марксісцкіх ідэй у рэгіёне. Іх арганізацыі разглядаліся як праможкавае звяно ў бальшавізацыі насельніцтва. Характэрнай асаблівасцю работ дадзенай тэматыкі з'яўляецца аднастайнасць ацэнак. Найбольшы інтарэс з тэматычнага спектра выклікаюць работы, прысвечаныя ўзаемаўплывам з прадстаўнікамі тытульнага насельніцтва. Працы адзначанага тэматычнага блоку адрозніваюцца ідэйнай разнастайнасцю, варыятыўнасцю падыходаў да асвятлення мінулага нацыянальных меншасцей. Асноўнай іх задачай з'яўлялася паказаць унікальны характар прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у Беларусі, актуалізаваць вывучэнне асобных этнічных груп і скласці агульнае ўяўленне пра іх гісторыю.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Практическое разрешение национального вопроса в БССР. – Минск : Изд. Нац. ком. ЦИК БССР, 1928. – Ч. 2 : Работа среди национальных меньшинств. – 159 с.
2. ***Цвяткоў, Л.*** Некалькі слоў аб менскіх татарах / Л. Цвяткоў // Наш край. – 1927. – № 6–7. – С. 10–17.
3. Дасягненні ў культурна-асьветнай працы сярод нацыянальных меншасцяй БССР к 10-ай гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі // Асьвета. – 1927. – № 7. – С. 135–145.
4. ***Дардак, Ю.*** Да гісторыі яўрэйскай школы ў БССР / Ю. Дардак // Асьвета. – 1926. – № 6. – С. 168–174.
5. ***Мышкоўскі, Л.*** Асьвета жыдоў на Беларусі да Лютаўскай рэвалюцыі / Л. Мышкоўскі // Беларусь : зборнік. – 1924. – С. 119–123.
6. ***Ігнатоўскі, У. М.*** Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. – 5-е выд. – Мінск : Беларусь, 1991. – 190 с.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17.
8. ***Сосіс, І. Д.*** Асноўныя моманты ў гісторыі жыдоўскага рабочага руху ў Беларусі / І. Д. Сосіс // Беларусь : зборнік. – 1924. – С. 141–147.
9. ***Агурский, С. Х.*** Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917) / С. Х. Агурский.– Минск : Бел.гос. изд., 1928. – 346 с.
10. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 8.
11. ***Heltman, S.*** Robotnik polski w Rewolucji Październikowejna Białorusi / Stefan Heltman. – Mińsk, 1927. – 136 s.
12. ***Бядуля, З.*** Жыды на Беларусі. Бытавыя штрыхі / З. Бядуля. – Менск : Друкарня Я. А. Грынблата, 1918. – 32 с.
13. ***Сосіс, І. Д.*** Яўрэі на Беларусі / І. Д. Сосіс // Спадчына. – 1992. – № 2. – С. 75–81.
14. ***Даўгяла, Дз. І.*** Цыганы на Беларусі : гістарычны нарыс / Дз. І. Даўгяла // Наш край. – 1926. – № 12. – С. 25–34.
15. ***Карскі, Я. Ф.*** Беларуская мова арабскім пісьмом / Я. Ф. Карскі / Веснік Наркомасьветы ССРБ. – 1922. – № 1. – С. 3–5.
16. ***Шлюбскі, А. А.*** Беларуская мова арабскай транскрыпцыяй / А. А. Шлюбскі // Наш край. – 1926. – № 6–7. – С. 51–53.
17. ***Вольскі, В. Ф.*** Татары на Беларусі / В. Ф. Вольскі // Наш край. – 1927. – № 4. – С. 25–29.
18. ***Вольскі, В. Ф.*** На конт нацыянальнай літаратуры беларускіх татар / В. Ф. Вольскі // Узвышша. – 1927. – № 4.
19. ***Вольскі, В. Ф.*** Беларускія элемэнты ў бытавой абраднасьці літоўскіх татар / В. Ф. Вольскі // Наш край. – 1929. – № 8–9. – С. 23–29.
20. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2.
21. ***Гембіцкі, Я. Х.*** Да пытання аб сацыяльна-эканамічным стане беларускіх татар у сярэднявеччы / Я. Х. Гембіцкі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Кніга 8. Працы клясы гісторыі. – Т. III. – С. 53–64.
22. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23.
23. ***Аўрагаў, В.*** У процэсе асіміляцыі : Нарыс з жыцьця літоўскае вёскі ў Беларусі / В. Аўрагаў // Чырвоны Сьцяг. – 1925. – № 3–4. – С. 10–15.
24. ***Мартэнсон, К.*** Зьбіраньне этнолёгічна-лінгвістычных матар'ялаў сярод латыскага насяленьня БССР / К. Мартэнсон // Наш край. – 1929. – № 3. – С. 53–54.
25. ***Скардзіс, В. І.*** Літоўцы на Беларусі (Нарыс аб літоўскіх колёніях) / В. І. Скардзіс // Наш край. – 1929. – № 6–7. – С. 25–34.
26. ***Скардзіс, В. І.*** Літоўцы на Беларусі (Нарыс аб літоўскіх колёніях) : працяг / В. І. Скардзіс // Наш край. – 1929. – № 8–9. – С. 8–22.


Паступіў у рэдакцыю 10.04.2019 г.
Кантакты: dzmitriy.krent@yandex.ru
(Крэнт Дзмітрый Аляксандравіч)

**Krent D. NATIONAL MINORITIES IN BELARUS PRESENTED IN THE BELARUSIAN SOVIET HISTORIOGRAPHY OF THE 1920s.**

*The article highlights the problem of the non-Belarusian ethnic groups viewed in the Belarusian Soviet historiography of the 1920s. The work is based on the publications and archival*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*materials on the history of national minorities in Belarus. The basic thematic units within which the past of the national minorities was studied are singled out. It is concluded that publications on political and education history show the uniformity of assessment due to their political bias. On the other hand, the studies on the mutual influence of national minorities and Belarusian population demonstrate different views on the history of national minorities in Belarus.*

**Keywords:** historiography, national minorities, national policy, education, political history, international cooperation.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова